

# Маюць права...

## Кніжніца

**У Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага адбыўся "круглы стол" пад назваю "Публічныя бібліятэкі Брэстчыны ў сістэме прававой інфармацыі".**

Гэта рабочая нарада дырэктараў бібліятэчных сістэм вобласці і бібліёграфаў, якія адказваюць непасрэдна за прававую адукацыю чытачоў. На нарадзе разглядаліся пытанні фарміравання прававой інфармацыйнай сістэмы рэгіёна, выкарыстання дакументаў, тэхнічных сродкаў і электронных баз дадзеных.

Дзяржаўная праграма па стварэнні публічных прававых цэнтраў у кніжных скарбніцах працуе больш як 10 гадоў, і запатрабаванасць прававых ведаў відавочная. Цяпер ужо рыхтуюцца да наступнага кроку — устаноўкі падобнай прававой базы ва ўсіх школах краіны. Маецца яна ў сельскіх Саветах і выканаўчых органах улады. "Тады ўзнікае пытанне — хто ж па такую інфармацыю прыйдзе ў бібліятэку? — тлумачыць сваю пазіцыю дырэктар Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Тамара Данілюк. —Але справа ў тым, што іншыя кропкі размяшчэння прававой базы абумоўлены графікам працы ўстаноў, а нашы цэнтры, у бібліятэках, працуюць нават у суботу і нядзелю, што вельмі зручна і агульнадаступна. Прыйдуць да нас і неабароненыя слаі насельніцтва, беспрацоўныя, хто шукае працу, хатнія гаспадыні, вымушаныя мігранты, каго цікавяць пытанні прапіскі, атрымання грамадзянства, студэнты і іншыя. Бясспрэчна, неабходна вучыць спецыялістаў, якія б працавалі з базай даных, каб маглі з веданнем справы дапамагчы і ў пошуку інфармацыі, і зрабіць невялікі каментарый. Бібліятэкары ў такім выпадку павінны быць крыху юрыстамі". На думку Тамары Паўлаўны, выдатнейшы вопыт маецца ў Польшчы — там у прававых цэнтрах ужо працуюць бібліятэкары, якія за кошт аддзела культуры атрымліваюць другую вышэйшую юрыдычную адукацыю. У рамках "круглага стала" адбылася прэзентацыя новых творчых праектаў 2010 года РВУ "Літаратура і Мастацтва", кніга выдавецтваў "Амалфея" і "Дикта".

**Ірына ТУЛУПАВА**

***На здымку:*** *дырэктар Брэсцкай абласной бібліятэкі Тамара Данілюк з удзельнікамі нарады.*

*Фота аўтара*